MEDIA PRIZE FOR CULTURAL DIVERSITY IN EASTERN EUROPE

1 ліпеня 2018 г.
Прэс-рэліз

Скончыўся Першы тэрмін прэміі АДАМІ 2018.

АДАМІ паведамляе, што 1 ліпеня 2018 году мінае тэрмін для падачы конкурсных дакументаў на прэмію АДАМІ 2018. Гэта тычылася матэрыялаў, паказаных у эфіры ці апублікаваных у перыяд з 10 кастрычніка 2016 па 31 снежня 2017 году.

Для тых відэаматэрыялаў і вэб-старонак, якія апублікаваныя пасля 1 студзеня 2018 году, конкурс працягваецца. АДАМІ заклікае журналістаў, кінематаграфістаў і аўдыёвізуальных прафесіяналаў падрыхтавацца і падаць заяўку на наступны тэрмін конкурсу.

Апошні дзень, калі магчыма падаць заяўку для АДАМІ 2018 - 1 кастрычніка 2018 году. Мы чакаем новых удзельнікаў. Для атрымання дадатковай інфармацыі і рэкамендацый пра падачу заявак, наведайце наш вэб-сайт. https://www.adamimediaprize.eu/competition-2018/

Прэмія АДАМІ прысуджаецца за лепшыя тэлевізійныя праграмы і фільмы, а таксама онлайн-праекты, якія тычацца міграцыі, інтэграцыі і этнічнай, рэлігійнай і культурніцкай разнастайнасці. Гэта унікальная магчымасць для прафесіяналаў у вобласці медыя прадставіць свае аўдыёвізуальныя працы на міжнароднай арэне, а таксама пашырыць кантакты з прадстаўнікамі тэлевізійных каналаў. Пераможцы ў кожнай з шасці намінацыяў узнагароджваюцца грашовымі прызамі. Акрамя асноўных прызоў кожнаму удзельніку конкурсу АДАМІ Медыя Прыз 2018 з журналісцскім досведам і валоданнем на працоўным узроўні русскай, нямецкайі ці французскай моваю, даецца магчымасць падаць заяўку на стыпендыю АДАМІ для стажыроўкі на каналах DEUTSCHE WELLE (Берлін, Нямеччына), MDR (Ляйпцыг, Нямеччына) ці ARTE (Страсбург, Францыя).

Прэмія АДАМІ Медыя Прыз прысуджаецца ў шасці
намінацыях: https://static1.squarespace.com/static/55a50358e4b0a6cc9fdf6f41/t/5a71ad5d8165f58f16a2ff0e/1517399413408/180130+Regulations+RUS.pdf

АДАМІ Медыя Прыз у вобласці культурніцка-забаўляльных праграм і фільмаў (гульнявыя фарматы)
АДАМІ Медыя Прыз у вобласці інфармацыйных праграм і фільмаў (негульнявыя фарматы)
АДАМІ Медыя Прыз за навінныя праграмы і негульнявыя кароткаметражныя фільмы
Малады АДАМІ
АДАМІ онлайн прыз за вэб старонку
АДАМІ онлайн прыз за онлайн відэа.

Для атрымання дадатковай інфармацыі і падачы заяўкі на ўдзел у конкурсу наведайце наш сайт https://www.adamimediaprize.eu/

Міжнародная журы-сесія для вызначэння намінантаў і пераможцаў кункурсу адбудзецца ў кастрычніку 2018 году ў Адэсе, Украіна. Пераможцы будуць абвешчаныя на гала-цырымоніі ўзнагароджання ў Кішынэве, Малдова ў лістападзе 2018 году, якая будзе трансляваць па міжнародных тэлевізійных каналах.

АДАМІ Медыя Прыз фінансуецца Міністэрствам замежных справаў Нямеччыны і ПроКрэдзіт Холдынгу (Нямеччына).

Чакаем вашых заявак!

ADAMi Медея Прыз за культурніцкую разнастайнасць
Вуліца Е. Габашвілі №14, Тбілісі, 0108 Грузія

Дадатковая інфармацыя: Communications@adamimediaprize.eu
Рэгістрацыя: Registration@adamimediaprize.eu
Тэл.: +995 32 298407